# «ЧАРОЎНЫЯ РЭЧКІ!»

## Рэкі і азёры Беларусі ў легендах і паданнях



**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**

**По гарызанталі:** 1. Луг. 7. Мелкае. 8. Рака. 9. Свіцязянкі. 12. Мора. 13. Крывое. 14. Плён. 17. Ліпна. 18. Гайна. 19. Доўжа. 20. Дзеяч. 22. Ялік. 23. Эсэіст. 26. Шнур. 27. Канаплянка. 29. Заяц. 30. Эрыдан. 31. Цна.

**По вертыкалі:** 2. Улас. 3. Венцер. 4. Памяло. 5. Бяздонка. 6. Крухмал. 10. Крапіўнік. 11. Кляйменне. 15. Радар. 16. Згода. 19. Дзявічча. 21. Чарніца. 24. Стаўры. 25. Святая. 28. Азон.

**Па гарызанталі: 1.** «Зялёны ..., як скінуць вокам,\\Абрусам пышным і шырокім\\Абапал Нёмна рассцілаўся». (Я.Колас. «Новая зямля»). **7.** Не глыбокае, а ... . Назва возера, якое знаходзіцца ў Бешанковіцкім раёне: паданне апавядае пра бойку ля гэтага возера Бога з д'яблам. **8.** Прыткая ... берагі падрываець (прык.). **9.** Міфічныя насельніцы возера, што ў Карэліцкім раёне: легенда сведчыць, што ў іх пераўтвараліся жанчыны горада Свіцязь, затопленага вадой. **12.** Герадотава ... . Так называўся вялізны вадаём, які некалі існаваў на месцы сучаснай Прыпяцкай нізіны. **13.** Вялікае возера на Ушаччыне; з такой назвай на Віцебшчыне існуе восем азёр, на Гомельшчыне — пяць і на Магілёўшчыне — тры возеры. **14.** Вынік старанняў, дасягненне. **17.** Возера ў Сенненскім раёне, у басейне ракі Чарнагосніца. **18.** «Чароўныя рэчкі!\\Іх назвы звіняць і шумяць у вушах:\\І Проня, і ..., і Ольса,\\І Бобр, і Уса, і Уша». (П.Панчанка. «Бярэзінскі запаведнік»). **19.** Возера на Пастаўшчыне; «Мяне цягнула да Пастаў,\\хацелася пабыць ля ...». (Ул. Дубоўка. «І колькі б дзе ні вандраваў»). **20.** Чалавек, які праявіў сябе ў якой-небудзь грамадскай дзейнасці. **22.** Невялікая шлюпка. **23.** Той, хто піша эсэ. **26.** Чарада птушак. **27.** Возера ў Шумілінскім раёне, у басейне р.Обаль; такую ж назву мае пеўчая птушка сямейства ўюрковых. **29.** У паляўнічага часта і ... пудовым бывае (прык.). **30.** Так у Сярэдняевеччы называлі Заходнюю Дзвіну. **31.** Рака, левы прыток Прыпяці; недалёка ад упадзення ... ў Прыпяць, на гары, жыў, як сведчаць паданні, старажытнарымскі паэт Авідзій.

**Па вертыкалі: 2.** Аўлас, або ... . Беларускі святы, апякун статка, прысвятак якога адзначалі ў лютым. **3.** Рыбалоўная сетка ў выглядзе нацягнутага на абручы мяшка. **4.** Венік з сасновых, яловых галінак, надзеты на доўгую палку. **5.** ..., або Бяздоннае. Возера ў Слонімскім раёне; з ім звязана паданне пра лютага пана, які кінуў у возера малое дзіцятка. **6.** Мучністае рэчыва, якога шмат у бульбе. **10.** Зараснік крапівы. **11.** Выпальванне знака на скуры жывёлы. **15.** Легендарны князь, якому паданне прыпісвае ўзнікненне ракі Заходні Буг і пабудову Камянецкай вежы. **16.** Аднадумнасць. **19.** Возера на Полаччыне; паводле падання, у гэтым возеры затанула шмат дзяўчат, якія ехалі па лёдзе на санках на вяселле. **21.** Чорна-сіняя лясная ягада; аналагічна на Міншчыне называюцца тры ракі і па адной на Магілёўшчыне і Гродзеншчыне, а на Віцебшчыне ёсць возера з такой назвай. **24.** ... і Гаўры. У беларускай міфалогіі — два сабакі легендарнага князя Бая, дзякуючы якім узніклі дзве вялікія беларускія рэкі — Дняпро і Дзвіна; паводле падання, ... і Гаўры былі пахаваны на Расоншчыне, ля берага возера Дрыса. **25.** ... Вялікая рака; так некалі называлі ў народзе раку Вілію. **28.** Газ з рэзкім пахам; ужываецца для ачышчэння вады, паветра.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,** *г. Дзяржынск.*

## УСМІХНЕМСЯ

**Мастак-абстракцыяніст не памятае, дзе ў яго карціна, а дзе ён пэндзаль выціраў.**

— Як называецца рэчыва, падчас прыёму якога мозг атрафіруецца і перастае адказваць за свае дзеянні?

— Семачкі!

**Калі жонка выходзіла за мяне замуж, яна паабяцала, што ўсё жыццё будзе кахаць толькі аднаго чалавека. Але потым высветлілася, што гэты чалавек — яе мама.**

— Я сыходжу ад цябе: ты вечна падколваеш мяне з-за лішняй вагі!

— Спыніся! Падумай аб нашым дзіцяці!

— Аб якім дзіцяці?

— Дык ты не цяжарная?

**Камп'ютар — гэта самае сапраўднае зло! Але калі яго выключыць, тут жа актывізуюцца два новыя — халадзільнік і тэлевізар.**

— Вовачка, як называецца свойская жывёла, чыё мяса ты звычайна ясі?

— Соя.




caricatura.ru

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.48 | 17.02 | 8.14 |
| Віцебск — | 8.43 | 16.46 | 8.03 |
| Магілёў — | 8.38 | 16.52 | 8.14 |
| Гомель — | 8.28 | 16.56 | 8.28 |
| Гродна — | 9.02 | 17.19 | 8.17 |
| Брэст — | 8.56 | 17.26 | 8.30 |

**Месяц**

*Поўня 17 лістапада.*
*Месяц у сузор'і Рака.*

**Імяніны**

***Пр.*** *Гаўрылы, Міхаіла, Рафаіла.*
***К.*** *Марыі, Рэгіны, Альберта, Кандрата, Яна.*

# ЗАЎТРА






Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Даты | Падзеі | Людзі**

*Міжнародны дзень адмовы ад курэння. Адзначаецца ў трэці чацвер лістапада ў многіх краінах свету па ініцыятыве Міжнароднага таварыства анколагаў пры падтрымцы Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Упершыню быў адзначаны Амерыканскім анкалагічным таварыствам у 1977 годзе.*

*Сусветны дзень тэлебачання. Абвешчаны Генеральнай Асамблеяй ААН 17 снежня 1996 года ў азнаменаванне правядзення першага Сусветнага тэлевізійнага форуму, які адбыўся ў штаб-кватэры ААН 21 лістапада 1996 года.*

**1831** год — у Ліёне як пратэст супраць паніжэння заработнай платы рабочым шаўкаткацкіх фабрык успыхнула паўстанне, на чорным сцягу якога красаваўся знакаміты і сёння лозунг: «Жыць працуючы або памерці змагаючыся» . Нацыянальная гвардыя адмовілася душыць беспарадкі, і праз пару дзён улада ў горадзе перайшла да паўстанцаў. Але праз дзесяць дзён у Ліён увайшлі 36 тысяч салдат, і паўстанне было задушана без якога-небудзь супраціўлення. Гэтае выступленне ліёнскіх ткачоў было кваліфікавана марксістамі як першае ў гісторыі пралетарскае паўстанне, якое, па іх сцвярджэнні, ярка сведчыла пра абуджэнне ў рабочых класавай свядомасці.



**1877** год — гэтае вынаходніцтва адкрыла для чалавецтва эру аўдыязапісу. Першы прыбор для запісу і прайгравання гуку — фанограф — быў вынайдзены Томасам Эдысанам у гэты дзень у 1877 годзе. Фанограф уяўляў сабой цыліндр, пакрыты алавянай фольгай. Гук запісваўся на носьбіце ў форме дарожкі. Першае, што ўдалося запісаць з дапамогай такой тэхнікі, былі словы з песенькі «У Мэры быў баранчык». Вынаходства фанографа прынесла Эдысану вядомасць. На працягу амаль 40 гадоў ён неадназова вяртаўся да яго, удасканальваў апарат. Пасля фанографа з'явіліся грамафон і патэфон.

**1926** год — спектаклем «У былыя часы» І. Бэна ў Віцебску быў адкрыты Другі беларускі дзяржаўны тэатр (БДТ-2). Трупу тэатра склалі выпускнікі Беларускай драматычнай студыі ў Маскве, сярод якіх былі Т. Бандарчык, Л. Мазалеўская, П. Малчанаў, С. Станюта, Л. Шынко і іншыя. У 1944 г. тэатру прысвоена імя Якуба Коласа, у 1977-м — званне акадэмічнага. Зараз гэта Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Я. Коласа.

**Было сказана**

**Уладзімір КАРАТКЕВІЧ, пісьменнік, паэт, публіцыст:**

***«Аптымізм беларускі ў тым, што, калі мы, нягледзячы на ўвесь песімізм і безнадзейнасць мінулага, усё ж жывём, значыць, у нас ёсць падставы гаварыць аб лепшым будучым».***

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара— галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 22.434. Індэкс 63850. Зак. № 4968.

Нумар падпісаны ў 19.30 20 лістапада 2013 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12